неабходнай назвы ў радку. У апошнім выпадку забяспечваюцца хуткі пошук і пазіцыяніраванне паказальніка ў спісе. Для доступу да адпаведнай інфармацыі неабходна націснуць экранную кнопку "прагляд". Для завяршэння работы ў гэтым рэжыме служыць экранная кнопка "закрыць".

Для папаўнення базы даных і карэкціроўкі інфармацыі ў сістэму ўключана спецыяльная праграма, якая забяспечвае ўвод тэкставых элементаў і метаінфармацыі ў базу даных. Элементы мультымедыя рыхтуюцца з дапамогай стандартных графічных, анімацыйных, гукавых і музычных праграмных сістэм і ўключаюцца ў базу даных з дапамогай гэтай праграмы. Праграма прызначана для выкарыстання толькі распрацоўшчыкамі базы даных.


***Стрыжонак І.М.**, ст. выкладчык*

***Чаплыгіна Т.І.**, ст. выкладчык*


# АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ-ЗАВОЧНІКАЎ ПА КУРСЕ "ТЭОРЫЯ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЫ" Ў МІЖСЕСІЁННЫ ПЕРЫЯД

Колькасць вучэбных гадзін, адведзеных на вывучэнне матэрыялу курса "Тэорыя бібліятэчнай справы", на факультэце завочнага навучання складае частку вучэбных гадзін, прадугледжаных вучэбным планам для студэнтаў дзённага аддзялення.

Таму зразумела, што пэўная частка праграмы курса студэнтам-завочнікам не чытаецца. Акрамя таго, сувязь студэнта-завочніка з факультэтам перапыняецца пасля сесіі на 2-3 месяцы. Таму асноўнай формай навучання студэнта-завочніка з'яўляецца самастойная работа ў міжсесіённы перыяд.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выкарыстанне дзейсных формаў і метадаў самастойнай работы, іх бесперапыннае ўдасканаленне – важныя ўмовы поспеху універсітэцкага завочнага навучання.

Асноўныя этапы самастойнай работы завочнікаў наступныя: установачныя метадычныя лекцыі; планаванне і арганізацыя самастойнай работы; вывучэнне рэкамендаванай літаратуры; складанне тэзісаў канспекта; слуханне лекцый, запіс і далейшая работа над іх тэкстам; падрыхтоўка да семінарскіх і практычных заняткаў; падрыхтоўка да залікаў і экзаменаў.

З асаблівымі цяжкасцямі ў арганізацыі самастойнай работы сутыкаюцца студэнты I курса, якія амаль не маюць навыкаў самастойнай работы.

Таму на ўстановачнай сесіі, у верасні, на першых лекцыях па курсе "Тэорыя бібліятэчнай справы" даюцца звесткі не толькі аб аб'екце, прадмеце бібліятэказнаўства, робіцца агляд развіцця і сучаснага становішча навукі, вызначаюцца значэнне курса і яго месца сярод іншых навук, але звяртаецца ўвага і на методыку арганізацыі самастойнай працы студэнтаў, бо ад арганізацыі і рэгулярнасці работы над вучэбным матэрыялам залежаць эфектыўнасць вывучэння і засваення курса.

Ідзе размова і пра падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, іншую літаратуру па курсе. Звяртаецца ўвага на методыку работы з імі, неабходнасць запісу прачытанага ў выглядзе разгорнутага плана, тэзісаў, выпісак, канспектаў.

Выкладчык вядзе гутарку аб мэтах, формах і методыцы правядзення семінарскіх заняткаў, звяртае ўвагу на методыку падрыхтоўкі да іх, знаёміць з тэматыкай кантрольнай работы па курсе і асноўнымі патрабаваннямі да яе выканання і афармлення.

Такім чынам, ужо на першых лекцыях даюцца тэарэтычныя і метадалагічныя ўстаноўкі для самастойнай працы студэнтаў. І ў працэсе саміх лекцый выкарыстоўваюцца розныя прыёмы арганізацыі самастойнай працы студэнтаў:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— невялікая гутарка (або апытанне) перад пачаткам лекцыі па змесце папярэдняй лекцыі;

— выкарыстанне практычнага вопыту працуючых у бібліятэках студэнтаў (напрыклад, аб асаблівасцях дзейнасці бібліятэк розных тыпаў і відаў у лекцыі па тэме "Сетка публічных і спецыяльных бібліятэк Беларусі");

— выкарыстанне прыёмаў праблемнага навучання (тэмы "Тыпалогія бібліятэк", "Сацыяльныя функцыі бібліятэк", "Бібліятэка і грамадства");

— дыялог, эўрыстычная гутарка, пытанні да выкладчыка па матэрыяле лекцыі.

На лекцыях па некаторых тэмах (напрыклад, "Цэнтралізаваныя бібліятэчныя сістэмы дзяржаўных масавых бібліятэк Беларусі" або "Сукупная сетка бібліятэк РБ") арганізуюцца невялікія дыскусіі, што садзейнічае фарміраванню ў студэнтаў умення аналізаваць, параўноўваць, супастаўляць факты, рабіць вывады і абагульненні.

Заключным этапам самастойнай работы на лекцыйных занятках (які ўжо выходзіць за яе часавыя рамкі) з'яўляецца заканчэнне работы над тэкстам лекцыі. Выкладчык рэкамендуе пасля лекцыі ўважліва перачытаць запісы, удасканаліць тое, што незразумела, запісаць на палях высновы, меркаванні, заўвагі, падкрэсліць асноўныя палажэнні і інш.

Далей студэнту рэкамендуецца прачытаць адпаведныя крыніцы і дапоўніць канспект. І толькі пасля гэтай самастойнай працы над канспектам па ім можна рыхтавацца да экзамену.

Асаблівае значэнне лекцыі ў арганізацыі самастойнай працы студэнта-завочніка абумоўлена тым, што на ёй студэнты не толькі атрымліваюць тэарэтычна і практычна значную інфармацыю, але і авалодваюць асноўнымі катэгорыямі і паняццямі бібліятэказнаўства, вучацца выкарыстоўваць атрыманыя веды ў сваёй практычнай дзейнасці.

Наступным этапам у набыцці навыкаў самастойнай працы па курсе, у развіцці самастойнага мыслення

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з'яўляецца падрыхтоўка да семінарскіх заняткаў. Студэнты вучацца самастойна аналізаваць спецыяльную літаратуру, выбіраць і запісваць найбольш важныя моманты, рыхтуюцца да вусных выступленняў.

Дапамогу ў арганізацыі самастойнай працы аказваюць выкладчыкі кафедры, яны рыхтуюць адпаведныя метадычныя ўказанні.

Выкладчык выкарыстоўвае розныя метады правядзення семінарскіх заняткаў: метад творчай гутаркі; адказы па выкліку выкладчыка, рэфератыўныя паведамленні, метад пісьмовага апытання і іншыя.

Такім чынам, у працэсе семінарскіх заняткаў не толькі паглыбляецца матэрыял па той ці іншай тэме, але ў выкладчыка ёсць магчымасць праверыць, як працуюць студэнты самастойна.

Важным сродкам актывізацыі самастойнай працы студэнтаў у міжсесіённы перыяд з'яўляецца выкананне імі вучэбных даручэнняў у пісьмовым выглядзе.

Выкананне кантрольнай работы па курсе "Тэорыя бібліятэчнай справы" садзейнічае засваенню матэрыялу курса (падбор тэм для кантрольнай работы дапамагае выкладчыку запоўніць непазбежныя пропускі ў лекцыйным курсе). Кантрольная работа – гэта ў значнай ступені і распрацоўка самімі студэнтамі матэрыялу лекцыйнага курса па пэўнай тэме. Гэта з аднаго боку. З другога, выкананне кантрольнай работы з'яўляецца найбольш рацыянальнай формай арганізацыі самастойнай працы студэнта-завочніка перад экзаменам па курсе. Выкладчыкі арыентуюць студэнтаў на магчымасць атрымаць кансультацыю па выкананні кантрольнай работы ў адпаведныя дні міжсесіённага перыяду.

Але ў гэты перыяд выкладчык не можа ажыццяўляць належны кантроль за працэсам выканання работы. Таму мы праводзім розныя формы вучэбнай работы па змесце кантрольнай работы і рэкамендаваных крыніцах. У ходзе сесіі адбываецца гутарка па змесце (або абарона) пісьмовых работ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Своеасаблівым дапаўненнем да лекцыйнага курса служаць і кансультацыі ў час сесіі і міжсесіённы перыяд. Яны больш шматбаковыя і шматгранныя па змесце, чым на стацыянары. У многіх выпадках дапаўняюць лекцыйны курс.

Па курсе "Тэорыя бібліятэчнай справы" праводзяцца розныя віды кансультацый: уводныя кансультацыі, прысвечаныя пытанням арганізацыі і методыкі самастойнай працы па курсе; бягучыя кансультацыі ў міжсесіённы перыяд (у дні завочніка або ў іншыя дні для тых, хто жыве ў Мінску); выніковыя (перадэкзаменацыйныя) кансультацыі.

Адной з формаў арганізацыі вучэбнага працэсу з'яўляюцца кансультацыі, якія, з аднаго боку, дапамагаюць студэнту найбольш рацыянальна арганізаваць сваю дзейнасць па авалоданні матэрыялам курса, а з другога боку, даюць выкладчыку магчымасць ажыццяўляць кантроль за самастойнай работай студэнтаў.

Для актывізацыі сістэматычнай самастойнай працы студэнтаў-завочнікаў у міжсесіённы перыяд трэба распрацаваць, на наш погляд, шэраг мер, у ліку якіх мэтазгодна прапанаваць наступныя.

Упарадкаванне планавай работы студэнтаў у міжсесіённы перыяд. Для гэтага можна скласці графік выканання самастойнай працы па курсах, расклады кансультацый і гутарак з выкладчыкамі ў міжсесіённы перыяд. Мэтазгодна арганізаваць правядзенне штотыднёвых кансультацый для тых студэнтаў, якія маюць магчымасць прыехаць у Мінск, а для тых, хто жыве далёка, па іх просьбе даваць пісьмовыя кансультацыі.

Паляпшэнне метадычнай дапамогі. Кожны год ва універсітэце друкуюцца метадычныя ўказанні па вывучаемых курсах, што значна дапамагае арганізацыі самастойнай працы ў міжсесіённы перыяд. Але дрэннае становішча склалася з вучэбнай літаратурай і вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі. У гэтай сітуацыі мэтазгодна друкаваць не толькі падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, але і асобныя тэксты лекцый або хрэстаматыі па спецыяльных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дысцыплінах (магчыма па курсах: для I курса, для II курса па асобных раздзелах).

Спалучэнне бягучага і выніковага кантролю як спосабу забеспячэння самастойнай сістэматычнай працы студэнтаў.

Для паляпшэння засваення матэрыялу курса "Тэорыя бібліятэчнай справы" мэтазгодна арганізаваць у верасні (для студэнтаў I курса на ўстановачнай сесіі, калі ў студэнтаў толькі лекцыі і няма іншых відаў заняткаў) экскурсіі ў буйныя універсальныя і спецыяльныя бібліятэкі г. Мінска.

Студэнты-завочнікі, большасць якіх пражывае не ў Мінску, на лекцыях разглядаюць тыпалагічныя асаблівасці універсальных і спецыяльных бібліятэк, на экскурсіях у іх з'явіцца магчымасць пазнаёміцца з гэтымі бібліятэкамі і асаблівасцямі іх дзейнасці.

Аптымізацыя самастойнай працы студэнтаў-завочнікаў з'яўляецца адным са шляхоў пераходу на новую тэхналогію навучання, што ў канчатковым выніку будзе садзейнічаць павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў ва універсітэце.

***Трамбіцкі У.У., ст. выкладчык***

## ДЫСКЕТЫ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ

Новыя тэхналогіі могуць садзейнічаць творчаму развіццю асобы і грамадства. Сацыяльная творчасць – вельмі шырокае паняцце. Асоба, выходзячы за межы працоўнай творчасці (якая з'яўляецца асноўным элементам сацыяльнай творчасці), раскрывае свае сутнасныя сілы ў сістэме культуры. Працэс культуратворчасці дапамагае фарміраванню асобы. Культуратворчасць – паняцце, што ўключае ў свой змест такія віды творчасці, як палітычная, прававая, маральная і іншыя. У гэтым артыкуле мы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ